**ВЫПРАБАВАНА НА САБЕ**

# ЗБОР УРАДЖАЮ АБ'ЯДНОЎВАЕ!

***Незабыўныя эмоцыі, выдатныя ўспаміны, знаёмства з цікавымі людзьмі і, вядома ж, бясцэнны вопыт і магчымасць зарабіць грошы, якія заўсёды так патрэбны студэнту, – усё гэта я атрымала гэтай восенню на сельскагаспадарчых работах, арганізаваных на базе РУП «Талачынскі кансервавы завод».***

Безумоўна, працаваць было няпроста. Асабліва ў першыя дні, калі я не ведала, што і як рабіць. Напрыклад, як правільна здымаць з дрэва плод у яблыневым садзе. Ды і ад штодзённага нашэння цяжкіх сумак з яблыкамі пастаянна балела ўсё цела.

Яшчэ складаней было працаваць на бульбасховішчы. Там ад холаду ратавалі толькі цёплы бушлат і смачны гарачы абед. На жаль, пасля працоўнага дня не заўсёды была магчымасць памыцца пад цёплай вадой у душы.

Але на гэтыя дробязі я не звяртала ўвагі, бо для мяне самым галоўным былі людзі побач, якія заўсёды маглі дапамагчы, падказаць і падбадзёрыць у цяжкую хвіліну.

Яшчэ запомнілася, як весела мы гулялі ў «Лазертаг» і «Мафію». І наогул увесь час, праведзены ў Талачыне, праляцеў для мяне вельмі хутка.

Сваімі ўражаннямі ад працы падзяліліся і іншыя ўдзельнікі студатрадаў, якія таксама пабывалі ў Талачыне.



**Раўшэн АТАБАЛАЎ (4 курс):**

– У верасні на сельскагаспадарчыя работы ў Талачын я паехаў не ў першы раз. Гэта была добрая магчымасць зарабіць грошы і трохі адпачыць ад заняткаў ва ўніверсітэце. У гэты раз я займаўся зборам яблык, быў камандзірам, таму арганізоўваў і кантраляваў працу іншых хлопцаў і дзяўчат. Сёння з лёгкасцю магу адрозніць адзін гатунак яблык ад другога.

Думаю, сельскагаспадарчыя работы ў Талачыне запомняцца мне надоўга. У нашым атрадзе царыў камандны дух і была цеплая рабочая атмасфера. За гэты час мы пасябравалі са многімі беларускімі студэнтамі. Разам гулялі ў «Мафію», «Лазертаг», валейбол і г.д.

На жаль, у гэтым годзе я заканчваю ВДУ. Але, калі б была магчымасць зноў паехаць на сельскагаспадарчыя работы, то я б з задавальненнем пагадзіўся.



**Сафія САЛАЎЁВА (3 курс ЮФ):**

– Гэта была мая трэцяя паездка ў Талачын. Нас засялілі ў гасцініцу, там жа знаходзілася сталовая. Самае складанае было тое, што мы працавалі калектыўна, таму твой заробак залежыў ад унёску кожнага ўдзельніка студатрада, бо колькасць сабраных яблыкаў дзялілася на ўсіх. Сельскагаспадарчыя работы ў Талачыне – гэта заўсёды новыя знаёмствы, вечары ў вясёлай кампаніі, бясцэнны вопыт працы ў камандзе.

У гэтым годзе БРСМ арганізаваў для нас гульню «Лазертаг». Каманды былі змешаныя, і гэта дапамагло беларускім і туркменскім хлопцам і дзяўчатам яшчэ больш згуртавацца і пасябраваць. Студэнты заўсёды шукаюць магчымасць зарабіць грошы і адначасова правесці час цікава. І Талачын для гэтага – цудоўны варыянт. Таму, думаю, што і ў наступным годзе я паеду ў складзе студатрада на сельскагаспадарчыя работы.



**Мікіта ДУБРОВА (2 курс ФМіІТ):**

– У гэтым годзе ў Талачын я паехаў упершыню. І змог папрацаваць усюды: займаўся пагрузкай бульбы ў фуры і яе адборам на канаееры, збіраў яблыкі. Умовы пражывання былі падобныя на тыя, што ёсць у студэнцкім інтэрнаце ВДУ. Добра, што харчаванне арганізавалі ў корпусе, дзе мы і жылі. На працу і назад нас прывозілі на аўтобусе.

Побач са мной знаходзіліся добрыя людзі, якія былі гатовыя прыйсці на дапамогу ў любой сітуацыі.

Самым складаным для мяне аказалася тое, што не было выходных. Вядома, можна было ў нядзелю застацца ў інтэрнаце, але хто ж хацеў губляць магчымасць папрацаваць за двайную аплату.

А яшчэ запомніўся выпадак, калі кіроўца аўтобуса забыўся аднаго хлопца, і мы вярталіся на паўдарозе, каб яго забраць. Наогул у Талачыне акрамя заробку я атрымаў выдатны вопыт і змог адпачыць ад разумовай працы. Ад паездкі засталіся толькі станоўчыя эмоцыі.

**Анастасія КАСЦЮКЕВІЧ, студэнтка 2 курса ФГіМК.**
**Фотаздымкі Наталлі ТАРАРЫШКІНАЙ і з архіву рэспандэнтаў.**

Фота - і відэарэпартаж з Талачына глядзіце з дапамогай Qr-кода.



